View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository



# Родавая спецыфіка лірыкі на сучасным этапе

Для сучаснай літаратуры, у тым ліку і для лірыкі, характэрна жанравая дыфузія, неакрэсленасць межаў паміж жанрамі. Так, лірычныя адзнакі аказваюць уплыў на "генетычна" эпічныя і драматычныя жанры, у сваю чаргу лірыка падвяргаецца ўздзеянню іншых родавых плыняў, на стыку літаратурных родаў узнікаюць новая "сінтэзныя" мастацкія адзінствы. У сувязі з гэтым актуальнай становіцца *праблема родавай спецыфікі сучаснай лірычнай паэзіі*, узнікае пытанне: ці не страчвае лірыка ў выніку такога ўзаемадзеяння сваёй родавай пэўнасці?

Лірычны род літаратуры пастаянна выклікаў вакол сябе палеміку. Неаднаразова ў расійскім і беларускім перыядычным друку, асабліва другой паловы XX ст., абмяркоўваліся праблемы лірыкі (напрыклад, праблема выражэння аўтарскай свядомасці ў лірычным творы, мэтазгоднасць ужывання тэрміна "лірычны герой" і інш.). У сувязі з пастаўленай праблемай варта прыгадаць дыскусію 1983 года на старонках рэспубліканскай газеты "Літаратура і мастацтва", распачатую артыкулам Т. Бондар "Паэзія ці версіфікатараства". Пісьменнікі, літаратуразнаўцы, крытыкі, чытачы абмяркоўвалі шырокае кола пытанняў сучаснай паэзіі: паэзія і час, паэзія і крытыка, паэзія і культура мовы, інтэлектуальнае і эмацыянальнае ў паэзіі, філасафічнасць паэтычнага твора, паэзія маладых... Удзельнікі дыскусіі не пакінулі без увагі і праблему родавай спецыфікі лірыкі на сучасным этапе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прынамсі, М. Мішчанчук у артыкуле "Не толькі страты!" падкрэсліваў, што заканамерны для ўсяго сучаснага слоўнага мастацтва працэс т. зв. "эпізацыі" не мог не закрануць і самы суб'ектыўны род літаратуры [1, с. 6]. З даволі рэзкай крытыкай палажэнняў названай публікацыі выступіў У. Калеснік (яго не задаволіла галоўным чынам трактоўка аўтарам артыкула ленінскай формулы пазнання). Калі ж адкінуць гэты (хутчэй ідэалагічны) момант, то ў прынцыпе У. Калеснік падтрымаў думку М. Мішчанчука аб узмацненні "эпічнага" ў сучаснай паэзіі, але разумеў гэты працэс больш вузка, звязваючы яго перш за ўсё з развіццём паэмнага жанру [2, с. 5 – 7]. У. Гніламёдаў настойліва раіў паэтам звяртацца да праблем сучаснасці. "Менавіта на гэтай лініі, – падкрэсліваў ён, – адбываецца насычэнне лірычнага "я" надзённымі сацыяльнымі матывамі, якія ўсё арганічней становяцца асабістым перажываннем паэта" [3, с. 7]. Менавіта так пашыраюцца межы лірыкі – яна ўзбагачаецца эпічнымі элементамі.

Адзнакі эпічнага роду актыўна ўздзейнічаюць і на беларускую лірычную паэзію апошніх дзесяцігоддзяў. Яскравым прыкладам яе "эпізацыі" з'яўляюцца версэты, вершаказы, зномы А. Разанава. Родава-жанравая размытасць і наватарства ў вялікай ступені ўласцівы паэзіі айчынных постмадэрністаў (М. Баярын, А. Глобус, З. Вішнёў і інш.). Мастацкія пошукі на мяжы двух літаратурных родаў вядуць прадстаўнікі самых розных літаратурных пакаленняў (У. Арлоў, Я. Брыль, В. Зуёнак, Я. Сіпакоў і інш.).

Па нашым меркаванні, "эпізацыя" лірыкі можа праяўляцца па-рознаму: змястоўна і фармальна, і **ніколі** гэты працэс поўнасцю не асімілюе лірычны літаратурны род. Па <u>форме</u> да эпічных набліжаюцца творы, у якіх аўтар

выяўляе свае пачуцці апасродкавана – праз вобразы “персанажаў” вершаў, праз адносіны (часта выяўленыя ў падтэксце) да пэўных жыццёвых эпізодаў, падзей, узноўленых у творы. У якасці фармальнага ўплыву эпічных адзнак можа разглядацца таксама *празаізацыя мовы* лірычнага твора (напр., у версэтах, вершаказах). На ўзроўні зместу “эпізацыя” бачыцца нам у філасофскім, маштабным асваенні “эпахальных” з’яў і падзей, асэнсаванні сучаснага сацыяльнага жыцця.

Сучаснае літаратуразнаўства не адмаўляе лірычнаму роду ў магчымасці звяртацца да сацыяльных праблем, да змен у знешняй аб’ектыўнай рэчаіснасці. Але як суадносіцца такі падыход з класічнаым, гегелеўскім? Агульнавядома, што Гегель разглядаў лірыку як “слоўнае *самавыражэнне* суб’екта”, выяўленне яго “суб’ектыўнага, унутранага свету” і эпас як адлюстраванне “аб’ектыўнага ў яго аб’ектыўнасці” [4, с. 419 – 420]. Услед за нямецкім філосафам рускі крытык В. Бялінскі ў артыкуле “Раздзяленне паэзіі на роды і віды” называў лірычную паэзію “царствам суб’ектыўнасці”, унутраным светам, які застаецца ў сабе і не выходзіць наверх [5, с. 296]. На першы погляд, прыведзеныя вышэй выказванні М. Мішчанчука і У. Гніламёдава супярэчаць замацаваным у савецкім, а затым і ў беларускім літаратуразнаўстве палажэнням. Аднак ужо Гегель падкрэсліваў, што лірычная паэзія не абмяжоўваецца самавыражэннем, у ёй (а не толькі ў эпасе) можа і павінен адлюстроўвацца аб’ектыўны свет, толькі спецыфічна: калі ён будзе адчуты, успрыняты і перажыты мастаком. Гэтым аўтар “Эстэтыкі” паказваў магчымасць узаемадзеяння двух літаратурных родаў і значна змяншаў катэгарычнасць іх супрацьпастаўлення.

Не знаходзіў прынцыповага адрознення паміж лірыкай і эпасам (у гнасеалагічным плане) і рускі літаратуразнаўца Г. Паспелаў. На яго думку, змест і лірычных, і эпічных твораў – гэта заўсёды адзінства свядомасці паэта, які пазнае жыццё, і жыцця, якое ім пазнаецца. Аднак вучоны бачыў адметнасць (у анталагічным плане) у прадмеце адлюстравання. Г. Паспелаў абмяжоўвае сферу лірыкі выражэннем “характэрнасці сацыяльнай свядомасці”, а эпасу – “характэрнасці сацыяльнага быцця” [6, с. 31 – 33, 62]. Калі прытрымлівацца такога погляду, то лірыка збяднее на вялікую колькасць твораў, што з’яўляюцца прамым і непасрэдным водгукам на быццё. Прынамсі, у лірыцы выдатнага мастака слова М. Багдановіча знаходзіць выяўленне не толькі яго глыбокі складаны ўнутраны свет, але і малюнкі, з’явы знешняй рэчаіснасці. Так, у вершах з паэтычнай нізкі “Места” (“За дахамі места памеркла нябёс пазалота...”, “Вулкі Вільні”, “У Вільні”, “На глухіх вулках – ноч глухая...”) узнаўляецца жыццё горада, фіксуецца імклівы рух урбаністычнай стыхіі. У прысвечаных роднай старонцы творах “Краю мой родны! Як выкляты Богам...”, “Народ, Беларускі Народ!..”, “Мяжы”, у якіх паўстае вобраз абяздоленага беларускага селяніна, М. Багдановіч не замыкаецца на раскрыцці толькі ўласнай свядомасці, але звяртаецца і да адлюстравання “характэрнасці сацыяльнага быцця”. Яркая, узрушаная паэзія пачатку 1920-х гг. А. Александровіча, А. Дудара, Я. Пушчы, М. Чарота, бясспрэчна, таксама выяўляе асабістыя пачуцці і перажыванні паэтаў, аднак выкліканы яны падзеямі паслярэвалюцыйнага грамадскага жыцця. Адзінства суб’ектыўнага свету

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

чалавека і аб'ектыўнай навакольнай рэчаіснасці яскрава ілюструе лірыка беларускага песняра Я. Купалы. Па вершах са зборнікаў "Жалейка", "Гусляр", "Шляхам жыцця", "Спадчына" можна прасачыць змены ў свядомасці Я. Купалы. Адначасова лірыка творцы дае карціну развіцця грамадска-гістарычнай сітуацыі на Беларусі ад пачатку стагоддзя да 1920-х гг.

Увага да знешняга свету, да змен у грамадскім жыцці ніяк не адмяняе родавай прыналежнасці твора да лірыкі. Вельмі слушнай падаецца нам палемічная заўвага сучаснага тэарэтыка літаратуры В. Халізева на гэты конт: "Лірыка ні ў якім разе не замыкаецца ў сферы ўнутранага жыцця людзей, іх псіхалогіі як такой. Яе нязменна прываблiваюць душэўныя станы, якія сведчаць пра засяроджанасць чалавека на знешняй яму рэальнасці. Таму лірычная паэзія аказваецца мастацкім асваеннем станаў не толькі свядомасці <...>, але і быцця" [7, с. 134]. Праз унутраны свет чалавека, узноўлены ў лірычным творы і ўвасоблены ў вобразе-перажыванні, можна меркаваць пра разнастайныя бакі знешняй рэальнасці, якія адбіліся ў свядомасці творцы і выліліся ў слоўныя вобразы.

Задача паэта-лірыка – праз адзінкавае, прыватнае наблізіцца да агульнага, універсальнага. Ператварэнне агульнага ў асабісты набытак суб'екта становіцца перадумовай і адной з вызначальных прыкмет лірычнай творчасці. "Лірычны верш, – па назіранні даследчыцы лірыкі Т. Сільман, – ёсць адначасова і нешта глыбока асабістае, і нешта бязмежна агульнае. Чым глыбей уцягваецца "аб'ект", знешні свет, у душэўныя глыбіні суб'екта, які перажывае, тым больш "обезличенным", тым больш агульназначным ён з гэтых глыбіняў вяртаецца" [8, с. 39]. Гэтую ж асаблівасць адзначае і Л. Гінзбург: "Самы суб'ектыўны род літаратуры, яна [лірыка. – Н. В.], як ніякі іншы, накіравана да агульнага, да адлюстравання душэўнага жыцця як усеагульнага" [9, с. 10]. Аўтары "Літаратурнага энцыклапедычнага слоўніка" (М., 1987) таксама падкрэсліваюць незамкнёнасць лірычнай паэзіі, яе скіраванасць на знешнюю рэчаіснасць і разглядаюць лірыку не як самавыражэнне суб'екта, а як выражэнне <u>суб'ектыўнага светаўспрымання</u> – індывідуальных, асабістых адносінаў да навакольнага свету [10, с. 184]. Такая асаблівасць лірыкі – праз выяўленнне асабістага перажывання сказаць пра аб'ектыўнае быццё, праз адзінкавае выразіць агульнае – адзначана ў многіх літаратуразнаўчых даследаваннях.

Лірыка – самы "аператыўны" род літаратуры – адгукаецца на змены ў жыцці, на падзеі сучаснасці, у пэўнай ступені "запазычваючы" прадмет "адлюстравання" ў эпасу. На нашу думку, гэтае "запазычанне" найбольш яскрава ілюструе *грамадзянская* лірыка, надзвычай шырока прадстаўленая ў нацыянальным слоўным мастацтве. Цікавасць да праяў сучаснага жыцця нарадзіла шмат таленавітых вершаў, хаця, вядома, не абыходзілася і без выдаткаў (прыгадаем сацыяльна ангажаваную паэзію многіх маладнякоўцаў, т. зв. вытворчую, рэпартажную лірыку, якую знойдзем і ў слынных мастакоў). Кардынальныя грамадскія пераўтварэнні 1980 – 90-х гг., якія прывялі да светапогляднага абнаўлення слоўнага мастацтва, выклікалі новы ўздым грамадзянскай лірыкі. Многія паэты звярнуліся да асэнсавання надзённых і вострых праблем часу, іх творы характарызуюцца палемічнасцю,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

устрывожанасцю, незаспакоенасцю. Пільную патрэбу выказаць сваю грамадзянскую пазіцыю ў гэты час адчулі вельмі многія паэты: П. Панчанка (зб. "І вера, і вернасць, і вечнасць", "Горкі жолуд", "Высокі бераг", "Зямля ў мяне адна"), Н. Гілевіч (зб. "Незалежнасьць", "Жыта, сосны і валуны", "Талісман"), Р. Барадулін (зб. "Маўчанне перуна", "Міласэрнасць плахі", "Евангелле ад мамы"), В. Зуёнак ("Лета трывожных дажджоў", "Чорная лесвіца", "Пісьмы з гэтага свету"), Г. Бураўкін (зб. "Узмах крыла", "Паміж зоркай і свечкай") і інш. Але ці з'яўляюцца такія вершы лірычнымі? Ці не страчваюць яны сваёй родавай адметнасці?

"Ці паэзія гэта?" – над гэтым пытаннем разважае М. Арочка ў кнізе "На парозе 90-х", маючы на ўвазе менавіта грамадзянскую лірыку. Ён катэгарычна не пагаджаецца з тымі, хто спрабуе "ўчыніць паэзіі "дэмаркацыйны" падзел – на "чыстую" і "нячыстую", кваліфікаваць апошнюю як не-паэзію" [11, с. 46]. Звяртаючыся да творчасці Я. Купалы і М. Багдановіча (менавіта да яго эстэтыкі апелююць сённяшнія прыхільнікі "чыстага" мастацтва), даследчык пераконвае ў абсурднасці такога размежавання [11, с. 45 – 50].

Па нашым перакананні, на гэтыя пытанні трэба адказаць станоўча: галоўнай у "грамадзянскіх" вершах па-ранейшаму застаецца *асоба*, якая выяўляе *свае* ўласныя пачуцці ў *вобразах-перажываннях*.

Бясспрэчна, побач з падобнай лірыкай існуе і "чыста" суб'ектыўная, зарыентаваная на "герметызм", засяроджаная на самасузіранні асобы, напрыклад, *медытатыўная* (ад лац. meditatio – самапаглыбленне, роздум) і *сугестыўная* (ад лац. suggestio – унушэнне, намёк) лірыка. Аднак новы жыццёвы змест мастацтва абумовіў тое, што "лірыка, захоўваючы сваю асноўную родавую прыкмету – застаючыся вобразам перажыванняў, захоўваючы свой суб'ектыўны пачатак, апасродкавана, праз *вобраз перажывання* ўсё больш і больш узнаўляе вобраз аб'ектыўнага свету" [12, с. 32].

Такім чынам, аб'ектыўная рэчаіснасць не з'яўляецца сферай засваення толькі эпасу. У лірыцы таксама перасатвараецца аб'ектыўны свет і ўвасабляецца ў перажываннях суб'екта – паэта. Лірыка пры гэтым не страчвае сваёй родавай паўнасці як асобны літаратурны род. Разам з тым неабходна яшчэ раз падкрэсліць, што т. зв. "эпізацыя" лірыкі – гэта не аднабаковы татальны працэс. Адваротны ўплыў – "лірызацыю" – адчуваюць на сабе эпічныя і драматычныя жанры. Для сучаснай літаратуры ў вялікай ступені характэрны "сінтэз" – перапляценне разнародных адзнак у межах мастацкага твора пры захаванні вызначальных родавых прыкмет. Таму не варта абсалютызаваць ніводзін з сустрэчных працэсаў, але ігнараваць іх пры аналізе літаратурнага твора таксама нельга.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ЛІТАРАТУРА


1. Мішчанчук М. Не толькі страты! // Літаратура і мастацтва. 1983. 6 мая.
2. Калеснік У. Крытэрый і ацэнка // Літаратура і мастацтва. 1983. 24 чэрв.
3. Гніламёдаў У. “...Твой крок чуваць” // Літаратура і мастацтва. 1983. 10 чэрв.
4. Гегель. Эстетика: В 4 т. Т. 3. М., 1971.
5. Белинский В. Г. Собр. соч.: В 9 т. Т. 3. М., 1978.
6. Поспелов Г. Н. Лирика: Среди литературных родов. М., 1976.
7. Хализев В. Е. Лирика // Введение в литературоведение. Литературное произведение: Основные понятия и термины: Учеб. пособие. М., 1999. С. 133 – 141.
8. Сильман Т. Я. Заметки о лирике. Л., 1977.
9. Гинзбург Л. Я. О лирике. М., 1997.
10. Песков А. М., Иванов Н. И. Лирика // Литературный энциклопедический словарь. М., 1987. С. 183 – 185.
11. Арочка М. М. Паэзія // Арочка М. М. і інш. На парозе 90-х: Літ. агляд. Мн., 1993. С. 12 – 93.
12. Мазепа Н. Р. В поэтическом поиске: Об эпическом и лирическом начале в современной русской поэзии. Киев, 1977.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ